Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №1(76), 2013

*УДК 821. 161. 3 – 34* Казлоў*

# Асаблівасці і роля адлюстравання ініцыяцыі ў творах Анатоля Казлова

С.Б. Цыбакова

Артыкул прысвечаны выяўленню асаблівасцей і ролі адлюстравання ініцыяцыі ў мастацкім свеце твораў А. Казлова. Разгляд паказу пасвячэння ў «дзяцей Гаспадара цемры» (А. Казлоў) у аповесцях «Адкуль з'яўляюцца яны?.. » і «Дзеці ночы», сувязі ініцыяцыі і міфалагічнага мыслення ў апавяданні «Верасава вечнасць» і ў аповесці «Расхрыстанасць, альбо далонь на плячы» дазваляе аргументаваць тыпалагічнае падабенства іх герояў, а таксама своеасаблівасць аўтарскага падыходу да раскрыцця псіхалогіі мужчыны, якая сфарміравалася пад канцэнтраваным уздзеяннем патрыярхальна-язычніцкай ініцыяцыйнай сацыяльна-культурнай традыцыі.
**Ключавыя словы**: ініцыяцыя, абрад, мадэль, традыцыя, патрыярхальны, язычніцкі, міфалагічнае светаўспрыманне, герой, дачкі Евы, псіхалогія.

In the article the peculiarities and role of the depiction of the archaic ceremony of initiation in the literary works by A. Kazlou are singled out. The consideration of the demonstration of adopting a man to a masculine unity in the story «A man of forty at he crossroads», initiation to «the servants of the Devil» (A. Kazlou) in the stories «Where do they come from?», and «Children of the night» and correlation between initiation and mythological world view in the story «Heather's Eternity», helps us explain typological similarity of the characters of these works as well as a special manner of the author's approach to the problem of contradictions in man's psychology which is formed by patriarchal-pagan tradition of initiation.
**Key-words:** initiation, ceremony, model, tradition, patriarchal, pagan, mythological world view, character, Eve's daughters, psychology

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ

Творчасць Анатоля Казлова вырастае з фальклорна-міфалагічнай традыцыі, цесна звязана са светапогляднымі вытокамі і асновамі народнай культуры, з язычніцкай містыкай і філасофіяй жыцця. Маленства і юнацкія гады пісьменніка прайшлі ў невялікай вёсачцы Асінаўка (усходняя Магілёўшчына), якая «месцілася сярод шыкоўных і багатых на грыбы ды ягады лясоў», і, «здаецца, хавалася ад цывілізаванага свету ў першародным і недасягальным кутку беларускай прыроды» [1, с. 147]. «… я вырас на легендах, фальклоры, на замовах і варажбе, на вераваннях, якія потым "вучоныя людзі" ахрысцілі "забабонамі"», – успамінае А. Казлоў [2, с. 33]. Гэты, на яго думку, «бясцэнны дар» [2, с. 33], і паслужыў галоўнай крыніцай створанага вобліку свету, у якім менавіта «міфалагічныя рэфлексіі адыгрываюць значную ролю» [2, с. 32].

Творы А. Казлова прасякнуты светаўспрыманнем, характэрным для традыцыйна-язычніцкай культуры, якая сфарміравалася ў старажытным грамадстве, дзе сярод так званых пераходных абрадаў вельмі важнае значэнне мела ініцыяцыя. Паводле азначэння У.М. Конана, ініцыяцыя (ад лац. initiatio – выкананне таінства, пасвячэнне) «у спецыфічна гістарычным сэнсе – абрады родавага грамадства, якія падрыхтоўвалі моладзь для пераходу ў склад дарослых людзей, гатовых для выканання сямейных і грамадскіх функцый» [3, с. 575]. Т.І. Шамякіна заўважае: «Важнейшы абрад пераходу – *ініцыяцыя*. Гэта вельмі цяжкія іспыты юнака – фізічныя і разумовыя, асабліва ў тым выпадку, калі чалавек прызначаўся для ролі шамана ці ваяра» [4, с. 193].

У прозе А. Казлова праходжанне героямі ініцыяцыі адлюстравана як у форме аўтарскага ўспаміну («Раздарожаны саракоўнік»), так і на вобразна-матыўным узроўні мастацкай структуры твора («Верасава вечнасць», «Адкуль з'яўляюцца яны?..», «Дзеці ночы»). Аднак ініцыяцыя не з'яўляецца акцэнтаваным прадметам аўтарскага асэнсавання. Яе адлюстраванне сведчыць аб значнасці для пісьменніка на падсвядомым узроўні той скарбонкі фальклорна-міфалагічных каштоўнасцей, якая была набыта шматлікімі пакаленнямі продкаў для сцвярджэння патрыярхальнай структуры і маралі грамадства, дзе да жаночага эгаізму, у тым ліку, і ў таком яго праяўленні, як вольныя паводзіны, ставіліся рэзка

негатыўна, стрымліваючы іх развіццё ў самым пачатку як, магчыма, небяспечныя для ўстаноўленага сацыяльнага парадку, біялагічных асноў яго існавання.

Разгляд адлюстраванага ў творах А. Казлова абраду пасвячэння дазваляе больш глыбока пранікнуць у загадкі душы і супярэчнасці псіхалогіі іх персанажаў. Паказ унутранага стану герояў, перажытага імі ў розны час, найбольш характэрны для аўтапсіхалагічнай прозы пісьменніка, да якой належыць аповесць «Раздарожаны саракоўнік». Яе кампазіцыйны план складаюць аб'яднаныя аўтарскай рэфлексіяй фрагменты з жыцця цэнтральнага персанажа – Антона Яновіча. Успамін пра «традыцыю-завядзёнку» [5, с. 228], якая калісьці існавала ў роднай вёсцы героя, перадае адзін з важных этапаў яго жыццёвага шляху і псіхалагічнага развіцця.

«Традыцыя-завядзёнка»[5, с. 228], абмаляваная ў творы, калі хлапчукоў чатырнаццаці гадоў прымалі «старэйшымі мацакамі ў сваё таварыства» [5, с. 228], – ёсць не што іншае, як ініцыяцыйны абрад, які ў рудыментарнай форме захаваўся ў «спрадвечна-першабытнай, не абпаленай і не скалечанай цывілізацыяй вёсачцы» [2, с. 33]. Адпаведна ўспаміну, «пасля прыёму мяняўся статус юнака, ён станавіўся паўнапраўным дзецюком», «раўнапраўным мужчынам не толькі ў сваёй хаце, але і ў вёсцы» [5, с. 228]. У адлюстраванні прымання ў «кагорту дзецюкоў» [5, с. 228] прасочваюцца наступныя складальнікі архетыпічнай мадэлі ініцыяцыі: 1) часовая ізаляцыя юнака ад ранейшага акружэння: *Звечарэла. Яновіч з торбаю за плячом крочыць да Аўдолінай хаты. Яна не так і блізка … Цёмналесаўская вуліца пустая. Хлопец адзін на ёй. Рэдкія агеньчыкі святла ў вокнах хат…* [5, с. 228–229]; 2) іспыты юнака, якія сімвалізуюць яго смерць і адраджэнне ў новай якасці: *Антона верне нават ад паху гэтага паскуднага зелля, але ён перасільвае сябе і, заплюснуўшы вочы, вылівае мутнаватую вадкасць у шырока разяўлены рот адным махам. Адчувае, як даўка скручваецца ў ж ываце страўнік, ён быццам выварочваецца навыварат. Але Яновіч цярпіць, толькі гучна ўцягвае ў нос паветра, ды без перапынку зглытвае сліну, якая бясконцай вяроўкай запоўніла рот* [5, с. 230]. А. ван Геннеп звяртае ўвагу на важнасць стану бяспамяцтва неафіта. Даследчык сведчыць: «У Амерыцы ён дасягаецца глытаннем соку тытуню і іншых раслін, якія валодаюць наркатычнымі ўласцівасцямі; у іншых месцах – спосабам акурвання, бічавання, катавання. Мэта – прымусіць навічка “памерці”, страціць успамін аб яго першапачатковай асобе і яго ранейшым свеце» [6, с. 78].

Чатырнаццацігадовы Антон Яновіч памірае як дзіця («саплівае хлапчанё» [5, с. 228], «падшыванец» [5, с. 229]) і нараджаецца як прадстаўнік таварыства мацакоў, аб'яднаных дэвізам: «Калі не будзеш умець жаць, то не будзеш пад стогам спаць, а калі не будзеш умець касіць, будзеш за дарослымі ваду насіць» [5, с. 230]. Пасля прачытання іншых твораў пісьменніка складваецца ўражанне, што рысамі мацака ў той ці іншай ступені надзеленыя многія іх героі (Антак Пераловіч, Юргон, Юджын, Вецер, Верас, Вірун), якія ў пэўным сенсе з'яўляюцца носьбітамі патрыярхальна-язычніцкай псіхалогіі, выконваючы ў дынамічна зменлівым і цывілізавана-фемінізаваным соцыуме своеасаблівую бацькоўска-мацакоўскую волю.

Устойлівым атрыбутам паводзін персанажаў твораў А. Казлова з'яўляецца «вогненная вада» [7], якая дазваляе «роздумнасць ды сур'ёзнасць» «загнаць у закуткі падсвядома сці» [7, с. 32]. Антак Пераловіч, Юргон, Юджын, Вецер, Вірун добра ведаюць жаночую псіхалогію і недарэмна выступаюць у ролі спакушальнікаў легкадумных і ахвочых да цялесных здавальненняў дачок Евы.

Матывы, звязаныя з «архетыпамі абраду ініцыяцыі» [3, с. 576], а таксама з універсальным супрацьпастаўленнем мужчынскага і жаночага пачаткаў, праходзяць праз апавяданне А. Казлова «Верасава вечнасць», мастацкі свет якога замацаваны ў архаічна-міфалагічным мысленні і абапіраецца на старажытную мадэль суровага іспыту на сілу і вынослівасць. «Гераічныя міфы ў прынцыпе будуюцца паводле той жа схемы, што і абрады пераходу. Вельмі важная іх частка – выпрабаванне героя», – лічыць Т.І. Шамякіна [4, с. 194]. У творы адлюстравана выконванне індывідуальнай гераічна-патрыярхальнай праграмы жыцця – быць мёртвым для спакусы негатыўнай жаноцкасцю (у язычніцкім успрыманні), каб застацца на баку мужнасці. Юнак Верас – ідэальны герой-мацак, які вытрымлівае ўсе ўскладзеныя на яго іспыты-спакусы і тым самым дае магчымасць далейшаму існаванню роднага племені. У вобразе Спакусніцы ўвасоблены адначасова рысы жанчыны-ваяўніцы

РЕПОЗИТОРИЙ ГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і загадкавай ведзьмы, што надае яму характар актыўнай і экспрэсіўнай антыжаноцкасці. Верас – тыповы гераічны персанаж, для якога сацыяльна-патрыярхальная звышзадача супадае з яго асабістымі імкненнямі да максімальнай рэалізацыі і раскрыцця ўнутраных здольнасцей, духоўнага патэнцыялу.

Непарыўная сувязь псіхікі героя творчасці А. Казлова з ініцыяцыяй прасочваецца ў аповесці «Расхрыстанасць, альбо далонь на плячы», дзе пяцідзесяцігадовы Вірун, шмат у чым падобны да «раздарожанага саракоўніка» Антона Яновіча, працягвае блукаць па лабірынтах сваёй падсвядомасці і сноў, якія становяцца каналамі душэўнага пераходу ў сялянска-патрыярхальны свет продкаў-мацакоў. Для інтэлігентнага сентыментальна-разважлівага і нават іншым часам меланхалічнага героя твора, прадстаўніка ўрбаністычна-цывілізаванага грамадства, пакаранне «блудлівіцы» – «вар'ятня суцэльная» [8, с. 64], але для яго ж, але ўжо як «нашчадка караючых быком» [8, с. 72] – гэта таксама спадчына, і ад яе немагчыма пазбавіцца. Паслядоўнік дзеда Кузьмы, які «ўжо цэлую вечнасць карае здраніцкае бабскае племя быком» [8, с. 64], Вірун павінен, насуперак лагічным довадам і асабістым пачуццям, «сачыць за норавамі ды вернасцю», паколькі спрадвеку «жаночая доля такая: быць вернай пад небам высокім толькі аднаму мужчыне» [8, с. 64].

Дзед Кузьма – увасабленне патрыярхальных прынцыпаў знешняй сілы і ўлады, у адпаведнасці з якімі са старажытных часоў акрэслены і замацаваны законы адносна месца жанчыны і яе паводзін, а раздарожанасць ці расхрыстанасць герояў А. Казлова адным са сваіх вытокаў мае амбівалентнае, супярэчлівае стаўленне да вышэйзгаданых прынцыпаў. Загадкавая нямая Моніка-Моня, магчыма, сімвалізуе ў аповесці жанчыну, якой не існуе наогул, і з'яўляецца вобразнай праекцыяй стану ўнутранага разладу індывідуальнасці героя.

Акрамя ініцыяцыі як абраду пераходу юнака ў мужчынскі саюз, у творах А. Казлова адлюстраваны пасвячэнні «дзеля дасягнення мудрасці, набыцця нейкіх сакральных ведаў» [4, с. 197]. Праходжанне ініцыяцыі ў форме пасвячэння ў дзяцей Уладара цемры складае галоўны матыў аповесці «Адкуль з'яўляюцца яны?..», напісанай пад уплывам фальклорна-міфалагічных уяўленняў пра людзей-паўдэманаў, ведзьмакоў. Н.А. Крынічная адзначае, што «ў міфалагічнай прозе вылучаецца цыкл апавяданняў, у якіх расказваецца аб перадачы і засваенні эзатэрычных (от греч. esoterikos – унутраны, г. зн. “тайны, скрыты”, прызначаны выключна для пасвячоных”) ведаў, аб здабыванні магічных здольнасцей» [9, с. 402].

Героі твора становяцца вучняміляснога чарнакніжніка, ад якога пераймаюць «пачаткі д'ябальскай навукі» [10, с. 46]. Выбраннікі нячыстай сілы, героі-юнакі, праходзяць пасвячэнне ў лясной хаце ведзьмака. Прыманне ў служкі Уладара цемры ўключае ў сябе розныя магічныя дзеянні (напрыклад, пасыпанне неафітаў попелам), замовы і закляцці, чытанне Чорнай кнігі пра «таямніцы ўладнага ўсясілля» [10, с. 44]. Вядзьмак Яўхім-гарбун называе сваіх вучняў «перанароджанымі» [10, с. 23] і дае ім новыя імёны. Праз адлюстраванне ініцыяцыі пісьменнік звяртаецца да асэнсавання сутнасці зла, якое з'яўляецца магутнай сілай і ў людскіх сэрцах няспынна «смалою кіпіць на сваіх паплечнікаў, суродзічаў, суседзяў» [10, с. 44]. Па словах Яўхіма, носьбіта чарнакніжнай мудрасці, «дабро і зло – палавінкі аднаго яблыка», але «мала хто ведае, з якога боку яго адкусіць» [10, с. 47].

Тэма зла і матыў лепкі «абраннікаў сілы Гаспадара» [11, с. 55] больш дэталёва і глыбока распрацоўваецца А. Казловым у містычнай аповесці «Дзеці ночы», героі якой, нягледзячы на тое што дзеянне адбываецца ў горадзе, шмат у чым духоўна падобныя да персанажаў міфапаэтычнай па сваіх вытоках аповесці «Адкуль з'яўляюцца яны?..». Паказ рытуалу прыёму ў сатанінскую секту служыць ў творы сродкам мастацкай дэталізацыі адлюстраванай рэчаіснасці і характараў персанажаў. Так, адным з атрыбутаў гэтага рытуалу з'яўляецца «культавы чэрап» – «чаша сілы і моцы», якая сімвалізуе з'яднанне «Дзяцей ночы» [11, с. 51]. Ведзьмака Яўхіма і прадстаўніка сталічнай эліты цыніка і сатаніста Максіма Гурона аб'ядноўвае прага ўсясілля і ўлады над людзьмі. Стварэнне вобразаў вакзальных бяздомнікаў, ахвяр для Гаспадара «дзяцей ночы» [11, с. 114], нікому не патрэбных людзей-сірот, якія страцілі сацыяльнае аблічча, надае аповесці гуманістычны ідэйна-мастацкі сэнс, выклікаючы ў памяці творы сусветнай і рускай літаратуры пра сацыяльных «адкідаў» [11, с. 54] і пасынкаў жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Такім чынам, выяўленне асаблівасцей і ролі, адлюстраванай ў апавяданні «Верасава вечнасць» і ў аповесцях А. Казлова ініцыяцыі, дазволіла аб'яднаць разгляд, здаецца, не звязаных паміж сабой тэматычных накірункаў і вобразаў яго прозы. Да архетыпа пасвячэння ўзыходзіць міфапаэтычны план мастацкага свету твораў «Адкуль з'яўляюцца яны?..» і «Верасава вечнасць». Героі аповесцей «Раздарожаны саракоўнік» і «Расхрыстанасць, альбо далонь на плячы» кроўна звязаны з патрыярхатам, якім з незапамятных часоў акрэслены нормы жаночых паводзін, прадстаўленняў аб долі і абавязках Адамавага рабра. Антон Яновіч і Вірун – «нашчадкі караючых быком», г. зн. тых, хто прайшоў ініцыяцыю, адлюстраваную ў аповесці «Раздарожаны саракоўнік». Кансерватыўна-суровыя, але ў той жа час і спакушальна-гуллівыя адносіны персанажаў твораў А. Казлова да дачок Евы караняцца ў глыбінях патрыярхальнай псіхалогіі, у тайніках язычніцка-родавой памяці. Пісьменнікам на падсвядомым узроўні раскрыта сутнасць міфалагічнага мыслення і той маралі, якія сфарміраваліся ў традыцыйна-патрыярхальным грамадстве, а таксама іх крызіс у сучасным свеце і звязаныя з ім унутраныя канфлікты асобы.

## Літаратура


1. Казлоў, А. Не люблю грыбоў ды ягад / Анатоль Казлоў // З росных сцяжын : аўтабіяграфіі пісьменнікаў Беларусі / уклад. Мікола Мінзер. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009. – с. 147–150.

2. …Там, дзе пачынаецца боль, – пачынаецца літаратура (*Празаік Анатоль Казлоў*) // Саламаха У.П. Сусвет дабрыні : эсэ, артыкулы, дыялогі / У.П. Саламаха. – Мінск : Маст. літ., 2005. – С. 28–36.

3. Конан, У.М. Ініцыяцыя / У.М. Конан // Беларускі фальклор : Энцыклапедыя : У 2 т. / Рэдкал. : Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2005. – Т. 1. – С. 575–576.

4. Шамякіна, Т.І. Міфалогія і беларуская літаратура : нарысы і эсэ / Т.І. Шамякіна; пасляслоўе І. Чароты. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 391 с.

5. Казлоў, А.С. Раздарожаны саракоўнік / А.С. Казлоў // Юргон : раманы, аповесці, апавяданні / Анатоль Казлоў. – Мінск : Маст літ., 2006. – С. 209–234.

6. Геннеп, А., ван. Обряды перехода. Систематическое изучение обрядов / А. ван Геннеп / пер. с франц. – М. : Издательская фирма «Восточная литература» РАН, 1999. – 198 с.

7. Казлоў, А. Паразумецца з Ветрам / Анатоль Казлоў // Маладосць. – 2009. – № 4. – С. 11–47.

8. Казлоў, А. Расхрыстанасць, альбо далонь на плячы / Анатоль Казлоў // Маладосць. – 2013. – № 2. – С. 47–72.

9. Криничная, Н.А. Русская мифология : Мир образов фольклора / Н.А. Криничная. – М. : Академический Проект; Гаудеамус, 2004. – 1008 с.

10. Казлоў, А. Адкуль з'яўляюцца яны?.. / А. Казлоў // І тады я памёр…: Аповесць, апавяданні. – Мінск : Маст. літ., 1993. – С. 3–53.

11. Казлоў, А.С. Дзеці ночы / А.С. Казлоў // Горад у нябёсах : аповесці, апавяданні / Анатоль Казлоў. – Мінск : Литература и Искусство, 2009. – С. 48–117.


Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 26.12.2013

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ